# МАЁ ЖЫЦЦЁ – МАЁ БАГАЦЦЕ

***Жыццё пражыць – не поле перайсці. Гэтая прыказка чамусьці ўсплывае ў памяці, калі пачынаеш аналізаваць ці ўзгадваць самыя яркія старонкі сваёй біяграфіі, асабліва напярэдадні юбілейнай даты нараджэння. І не важна, колькі табе гадоў.***

***Здаецца мне, што і нашыя юбіляры – доктар гістарычных навук, прафесар Іван Уладзіміравіч Мандрык і кандыдат гістарычных навук, дацэнт Віктар Уладзіміравіч Акуневіч – падчас святкавання на нейкую хвілінку ў думках прайшліся па сваім жыццёвым полі і спыніліся на незабыўных яго месцах. Зрэшты, няхай юбіляры самі раскажуць пра сябе.***



**Іван Уладзіміравіч Мандрык:** «Немагчыма сказаць, што нейкі перыяд майго жыцця ўдалы, а нейкі – не зусім. Не буду крывіць душой: жыццё было складаным, працоўную біяграфію пачынаў токарам. Затым былі камсамол, партыйная работа, навуковая дзейнасць. Кандыдацкую дысертацыю абараніў у 1982 годзе. Гэта былі надзвычай плённыя гады. Я быў вельмі рады, што трапіў у кагорту людзей, якія мелі навуковыя ступені. Хоць пасада сакратара партыйнай арганізацыі ў нашым універсітэце была для мяне важнай, усё ж такі я вырашыў цалкам прысвяціць сябе навуцы і пісаць доктарскую дысертацыю. За два гады сабраў увесь матэрыял і быў гатовы ўжо да абароны, але адбылася нечаканасць – развал Савецкага Саюза, а разам з ім – і перасэнсаванне каштоўнасцей. Я быў вымушаны яшчэ дзесяць гадоў дапрацоўваць сваю доктарскую дысертацыю, а ў 2004 годзе яе абараніў.

Плённым перыядам для мяне быў той час, калі я 15 гадоў узначальваў Віцебскі філіял Міжнароднага інстытута працоўных і сацыяльных адносін. Потым вырашыў звязаць свой лёс з нашым універсітэтам. Сёння я атрымліваю задавальненне ад сваёй працы на гістарычным факультэце, дзе рыхтуюць добрых спецыялістаў, якія прынясуць карысць нашай дзяржаве. І калі б у мяне спыталі сёння, што б я хацеў змяніць у сваім жыцці, то адказаў бы: нічога, толькі б улічыў памылкі мінулага, каб зноў не наступіць на адны і тыя ж граблі».



**Віктар Уладзіміравіч Акуневіч:** «У маім жыцці я б вылучыў два самыя плённыя перыяды. Першы звязаны з навуковай дзейнасцю, якой я займаўся вельмі актыўна: напісанне кандыдацкай дысертацыі і яе абарона, даследаванні ў пэўных накірунках (нацыянальна-вызваленчы рух, грамадскі рух, гісторыя Віцебшчыны). Другі перыяд жыцця звязаны пераважна з педагагічнай дзейнасцю. Падчас працы ў школе я атрымаў вышэйшую катэгорыю настаўніка, а мой вучань двойчы перамагаў на алімпіядзе па гісторыі ў рэспубліцы. Больш за 30 гадоў я працую са студэнтамі. Яны ў нас добрыя, старанныя, дапытлівыя, імкнуцца як мага больш ведаць. На сваіх занятках я вучу іх думаць: не ўспрымаць гісторыю як нейкую казку ці паданне, а разважаць, аналізаваць – гэта самае галоўнае. Цікаўнасць хлопцаў і дзяўчат да гісторыі падштурхоўвае мяне грунтоўна рыхтавацца да заняткаў, адшукваць новыя факты.

Жыццём сваім я цалкам задаволены. Я фаталіст, таму як яно складваецца, так няхай і складваецца. Некаторых памылак толькі, магчыма, цяпер не зрабіў бы...»

**Ірына МІКУЦКАЯ,**
**студэнтка 3 курса ФлФ.**



***Паважаныя***
***Іван Уладзіміравіч***
***і Віктар Уладзіміравіч!***

*Калектыў гістарычнага факультэта віншуе вас з Днём народзінаў! Шчыра зычым моцнага здароўя, невычэрпнай энергіі, плёну ў працы, навуковых адкрыццяў, дабрабыту, шчасця!*